*Пяты этап гістарыяграфіі: развіццё беларускай фалькларыстыкі ў 1945–1991 гг.*

Праца па збіранню і вывучэнню беларускага каляндарна-абрадавага фальклору аднавілася ў 1945 г., калі была праведзена экспедыцыя Інстытута гісторыі АН БССР. У Інстытуце пачаў працу сектар этнаграфіі і фальклору, які стаў цэнтрам для збору і вывучэння народнай творчасці.

У 1957 г. на базе названага сектара быў утвораны Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР (ІМЭФ). Стварэнне Інстытута стала важным крокам на шляху да каардынацыі навуковых даследаванняў беларускай культуры.

У канцы 1950-х гг. пры ІМЭФ быў створаны фальклорны архіў, які з’яўляецца фундаментальным зборам усіх відаў і жанраў беларускага фальклору.

Палявыя экспедыцыі ў ІМЭФ распачаліся ў 1960 г. Істотны ўплыў стратэгіі і практыку збірання фальклорных матэрыялаў аказала падрыхтоўка да выдання шматтомнага зводу “Беларуская народная творчасць”, прысвечанага ўсім жанрам і відам беларускага фальклору. З гэтай мэтай у кожную вобласць БССР былі арганізаваны комплексныя палявыя экспедыцыі. У 1969 г. была абследавана Брэсцкая вобласць; у 1970 г. – Гродзенская вобласць; ў 1971 г. – Віцебская вобласць; ў 1972 г. – Мінская вобласць; у 1973 г. – Магілёўская вобласць. Адбылося некалькі экспедыцый ва ўсе раёны Гомельскай вобласці ў 1960-1969 гг. і ў 1972-1984 гг. Асноўная колькасць фальклорных матэрыялаў была сабрана ў савецкія гады такімі даследчыкамі, як Майсей Грынблат, Арсень Ліс, Анатоль Фядосік, Канстанцін Кабашнікаў, Галіна Барташэвіч, Антон Гурскі, Лія Салавей, Леаніла Малаш, Іван Цішчанка і г.д.

Зборам і вывучэннем фальклору заняліся моўныя і літаратурныя кафедры ВНУ. Так, на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта з 1960-х гг. адбывалася збіранне фальклору ў межах фальклорнай практыкі студэнтаў. Гэтую працу ўзначалілі выкладчыкі Н. С. Гілевіч і В. Захарава. Пры ўстанове былі падрыхтаваны тры зборнікі каляндарна-абрадавага фальклору ў сучасных запісах, прысвечаныя Брэсцкай, Мінскай і Гомельскай абласцям. У 1981 г. у БДУ была адкрыта навукова-даследчая лабараторыя беларускага фальклору.